В статье описана лишь часть проводимой работы с объектами историко-культурного наследия Ветковского района в 2020–2022 гг., тем не менее она свидетельствует о значимости дальнейшего сохранения и охраны элементов нематериального проявления творчества белорусов. Ветковская земля имеет богатый духовный потенциал, что дает возможность его дальнейшего использования для популяризации отечественной культуры.

## СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ


*1.* Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. – Электрон. версія. – Рэжым доступу: http://gosspisok.gov.by. – Дата доступу: 10.09.2022.

*2. Кирбай, А. Д.* Современное состояние и перспективы охраны историко-культурного наследия Ветковского района / А. Д. Кирбай // Творчество молодых: сборник научных работ студентов, магистрантов и аспирантов : в 3 ч. – Гомель, 2022. – Ч. 3. – С. 225–228.

*3.* Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры : 20 ліп. 2016 г. № 413-З : прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г. : адобр. Саветам Рэсп. 30 чэрв. 2016 г. – Электрон. версія. – Рэжым доступу: https://president.gov.by/ru/events/podpisan-kodeks-respubliki-belarus-o-kulture-14082. – Дата доступу: 09.09.2022.

*4.* О Государственной программе «Культура Беларуси» на 2021–2025 годы : постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 29 янв. 2021 г., № 53. – Электрон. версия. – Режим доступа: https://etalonline.by. – Дата доступа: 09.09.2022.

*5.* Основные тексты Международной конвенции об охране нематериального культурного наследия 2003 г. – Издание 2018 г. – Электрон. версия. – Режим доступа: https://ich.unesco.org. – Дата доступа: 09.09.2022.



УДК 398.33(476)



**Т. І. Кухаронак,**

*кандыдат гістарычных навук, дацэнт, старшы навуковы супрацоўнік аддзела народазнаўства дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*


# КАЛЯНДАРНЫЯ СВЯТЫ І АБРАДЫ ЯК ЭЛЕМЕНТЫ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСАЎ (вопыт і перспектывы)


**Анатацыя.** *У артыкуле прааналізавана практыка надання каляндарным святам, звычаям і абрадам статусу гісторыка-культурнай не-*

*матэрыяльнай каштоўнасці ў Рэспубліцы Беларусь. Выяўлены асаблівасці іх функцыянавання на сучасным этапе, перспектывы захавання, віды і спосабы рэпрэзентацыі.*

**Ключавыя словы:** *традыцыя, свята, абрад, нематэрыяльная культурная спадчына, арэал.*

**T. Kukharonak,**
*PhD in History, Associate professor, Senior Researcher, Ethnology Department of the Center for the Belarusian Culture, Language and Literature Researches of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Republic of Belarus*

## CALENDAR HOLIDAYS AND RITUALS AS ELEMENTS OF THE INTANGIBLE CULTURAL HERITAGE OF BELARUSIANS (EXPERIENCE AND PROSPECTS)

**Abstract.** *The article analyzes the practice of giving calendar holidays, customs and rituals with the status of historical and cultural intangible value in the Republic of Belarus. The author reveals the features of their functioning at the current stage, prospects for preservation, types and methods of representation.*

**Key words:** *tradition, holiday, ritual, intangible cultural heritage, areal.*

Традыцыйныя каляндарныя святы беларусаў – найважнейшая сфера жыццядзейнасці нашага народа. Каляндарна-абрадавы комплекс выступае адным з найгалоўных чыннікаў, што ўплываюць на вызначэнне ідэнтычнасці народа і ўключэнне ў прастору народнай культуры. Святы разгортваюцца на аснове існавання духоўных сувязей паміж людзьмі і спрыяюць фарміраванню пачуцця гармоніі быцця, дэманструюць жыццесцвярджальны характар народнага светаразумення. Кожнае з каляндарна-абрадавых свят мае разгалінаванае мастацкае афармленне і абуджае эмацыянальныя перажыванні ўдзельнікаў, што пацвярджае яго каштоўнасна-ідэалагічнае значэнне ў грамадстве. Першапачатковы сакральны сэнс абраду трансфармуецца ў вобразна-паэтычную форму калектыўных дзеянняў, якія прайграваюцца кожным наступным пакаленнем [4, с. 3, 14].

На сёння каляндарныя святы, звычаі і абрады, датычныя да іх фальклорныя тэксты як адна з праяў нематэрыяльнай культурнай спадчыны беларусаў грунтоўна даследаваны. У канцы XIX – пачатку XX ст. многія народазнаўцы – У. Дабравольскі, М. Дзмітрыеў, М. Доўнар-Запольскі, Я. Карскі, М. Нікіфароўскі, Е. Раманаў, А. Сержпутоўскі, М. Федароўскі, А. Шлюбскі, П. Шпілеўскі, П. Шэйн – вывучалі традыцыйную абраднасць беларусаў. Пазнейшыя і сучасныя даследаванні беларускіх навукоўцаў Г. Барташэвіч, Т. Валодзінай, Т. Варфаламеевай, У. Васіле-

віча, М. Грынблата, А. Гурскага, Р. Кавалёвай, Т. Кухаронак, А. Ліса, З. Мажэйкі, В. Новак, Л. Салавей, А. Фядосіка, І. Цішчанкі не толькі выявілі і зафіксавалі, але і абагулілі багаты пласт народнай спадчыны беларусаў.

У пачатку 2000-х гг. пасля прыняцця на Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА Міжнароднай канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны [6] і далучэння да яе Рэспублікі Беларусь тэрмін «нематэрыяльная культурная спадчына» (далей – НКС), куды ўваходзяць «звычаі, традыцыі, абрады, фальклор (вусная народная творчасць)», стаў выкарыстоўвацца ў сацыяльна-культурнай практыцы, заканадаўчых дакументах, айчынных навуковых даследаваннях. Паступова ў нашай краіне на дзяржаўным узроўні пачала стварацца і фарміравацца сістэма захавання і аховы культурнай спадчыны, у тым ліку НКС.

Мэта артыкула – прааналізаваць практыку надання каляндарным святам, звычаям і абрадам статусу гісторыка-культурнай нематэрыяльнай каштоўнасці і іх аховы ў Рэспубліцы Беларусь, выявіць віды і спосабы іх рэпрэзентацыі на сучасным этапе.

Сёння ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, прынятых пад ахову дзяржавы, уключана каля 30 каляндарных свят, абрадаў, абрадавых гульняў, карагодаў, прымеркаваных да народнага календара. Гэта ігрышча «Ката пячы» (абрадавая гульня) на Загавенне перад Піліпаўкай аг. Скірмантава Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці; каляднае абрадавае ігрышча моладзі «Жаніцьба Цярэшкі» в. Аношкі Лепельскага раёна Віцебскай вобласці; народная гульня моладзі «Яшчар», прымеркаваная да Калядаў і Купалля, Пастаўскі раён Віцебскай вобласці; калядны абрад «Цары», які праводзіцца на Шчодры вечар (13 студзеня), в. Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці; калядны абрад «Шчадрэц» в. Рог Салігорскага раёна Мінскай вобласці; абходны абрад калядавання/шчадравання «Куры», які праводзіцца на Шчодры вечар у в. Дзмітраўка, Віркаў і Нясета Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці; традыцыя шчадравання «Конікі» г. п. Давыд-Гарадок Столінскага раёна Брэсцкай вобласці; абрад «Цягнуць Каляду на дуба» в. Новіны Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці; масленічная абрадавая гульня «Пахаванне дзеда» (пачатак Масленіцы) в. Маскаляняты і Даўгаполле Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці; абрад гукання вясны «Чырачка» аг. Тонеж Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці; абрадавы карагод «Стрылка» в. Бездзеж Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці; абрад «Ваджэнне Сулы» на другі дзень Вялікадня в. Гадзічава і Маркавічы Гомельскага раёна Гомельскай вобласці; карагод «Лука», прымеркаваны да Велікодных свят, аг. Маркава Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці; традыцыя пакланення каменным крыжам («Каменныя дзевачкі»), прымеркаваная да Велікодных свят, в. Данілевічы і Баравое Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці; традыцыя веснавых карагодаў на Вялікдзень,

Праводную нядзелю і «Провады зімы» в. Пінкавічы Пінскага раёна Брэсцкай вобласці; абрад «Намскі Вялікдзень», які праводзіцца ў чацвер Велікоднага тыдня, в. Аброва Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці.

А таксама абрад «Юр'я» (вясновы абрад «Юраўскі карагод») в. Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці; абрад «Юр'я» в. Ахонава Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці; абрад «Ваджэнне і пахаванне стралы» в. Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці; абыдзённы абрад «Намётка», які праводзіцца на свята Спаслання Духа Святога на апосталаў па календары каталіцкай канфесіі («Зялёныя свёнткі»), в. Папшычы Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці; абрад ваджэння куста на другі дзень Тройцы аг. Лобча Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці; абрад «Провады русалкі» в. Вялікі Бор Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці; абрад «Розгары» аг. Лукомль Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці; абрад «Бразгун» (і яго складовы элемент – шанаванне іконы святых Пятра і Паўла) праводзіцца 13 ліпеня, в. Наркі Чэрыкаўскага раёна Магілёўскай вобласці.

Традыцыя памінання продкаў аг. Раздзялавічы Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці; абрад «Перанос Міхайлаўскай свячы» аг. Вяляцічы Барысаўскага раёна Мінскай вобласці; абрад «Варварынская свяча» в. Басценавічы Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці.

Два з гэтых абрадаў, а менавіта калядны абрад «Цары» в. Семежава Капыльскага раёна (2009), і абрад «Юр'я» (вясновы абрад «Юраўскі карагод») в. Пагост Жыткавіцкага раёна (2019), уключаны ў Спіс тэрміновай аховы аддзела нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА.

Кожнае з гэтых свят/абрадаў з'яўляецца адметным праяўленнем лакальнай культурнай традыцыі канкрэтнай мясцовасці. Аналіз матэрыялу, які ёсць у наяўнасці, дае падставы канстатаваць, што большасць з іх прыйшлося аднаўляць, бо абрады былі ўласцівы дадзенай мясцовасці, па нейкіх прычынах некаторы час не выконваліся, але пра іх жывое бытаванне памяталі мясцовыя носьбіты традыцыі (захоўваліся ў пасіўнай памяці старэйшага пакалення). Затым свята/абрад былі ўзноўлены па традыцыйнай схеме (мясцовых узорах і палявых запісах) і на сённяшні дзень праводзяцца жыхарамі вёскі, а не арганізоўваюцца разава па сцэнарыях работнікаў культуры. Прыклады – калядны абрад «Цары» в. Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці; абрад «Цягнуць Каляду на дуба» ў в. Новіны Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці; масленічная гульня «Пахаванне дзеда» ў в. Маскаляняты Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці; абходны велікодны абрад «Стрылка» ў в. Бездзеж Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці; «Провады русалкі» ў в. Вялікі Бор Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці; абрад «Ваджэнне Сулы» на другі дзень Вялікадня ў в. Маркавічы Гомельскага раёна Гомельскай вобласці; абрад ваджэння куста ў аг. Лобча Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці і інш.

Як бачым, найбольш прадстаўнічым аказаўся зімовы цыкл і найперш Каляды, чаму ёсць шэраг прычын. Пэўная паўтаральнасць выканання абраду з аднолькавымі элементамі-тэкстамі абумоўлівае наяўнасць традыцыі. Традыцыя, у сваю чаргу, вызначае сталасць функцыянавання форм культуры і такім чынам наяўнасць фактараў, што забяспечваюць яе аднаўленне. Існаванне такіх фактараў (стэрэатыпаў) звязана з перыядычным паўтарэннем пэўных сітуацый і патрэб [5, с. 132–134]. Сітуацыя, якая паўтараецца, у дадзеным выпадку – прыродны гадавы цыкл, каляндарны год, у межах якога Каляды з'яўляюцца адным з буйнейшых свят, замацаваных за кропкай зімовага сонцавароту. Сама атмасфера свята, як незвычайнага «сакральнага» часу, якому адпавядае святочны настрой, святочныя адносіны, рэальна-ідэальныя ці ўмоўныя паводзіны, святочнае адзенне і інтэр'ер, святочныя стравы, садзейнічае жыццяздольнасці абраду.

Вядома, што элементы нематэрыяльнай культуры могуць быць агульнанацыянальнымі па сваім значэнні, але па паходжанні і геаграфіі бытавання – заўсёды вузкалакальныя, належаць лакальнай супольнасці і існуюць у лакальнай культуры, якая складваецца пад уплывам неаднароднасці прыродна-геаграфічнага асяроддзя і ўздзеяннем рознага набору фактараў (сацыяльных, гістарычных і інш.) у межах пражывання некаторай сацыякультурнай супольнасці (дзяржаўна-тэрытарыяльнай адзінкі) і выклікае існаванне разнастайных лакальных вопытаў і лакальных ідэнтычнасцей [3, с. 17–21].

Намаганнямі навукоўцаў, метадыстаў, культработнікаў нашай краіны была выпрацавана метадалогія і методыка выўлення і апісання каляндарных звычаяў і абрадаў як феноменаў НКС, паводле якіх крытэрыямі адбору з'яўляюцца: спрадвечнасць існавання на дадзенай тэрыторыі без значных перапынкаў; гістарычная і культурная значнасць для насельніцтва, якое пражывае на пэўнай тэрыторыі і якое гэтую значнасць і неабходнасць у сваім жыцці ўсведамляе; самабытнасць і пераемнасць (перадача ад пакалення да пакалення), што садзейнічае павазе да абраду з боку моладзі, мігрантаў і г. д.; багаты міфапаэтычны стрыжань (увасабленне ў пэўных дзеях, вобразах, артэфактах міфалагічных ідэй); крытэрый унікальнасці (адзіны ў сваім родзе, што мае высокую мастацкую каштоўнасць) даволі адносны, бо лічыцца феноменамі НКС могуць абрады, добра вядомыя і на іншых тэрыторыях, якія, аднак, у дадзенай мясцовасці захавалі свой каларыт. Пры выяўленні і апісанні каляндарна-абрадавага комплексу як феномена НКС трэба ўлічваць яго функцыі, практычна-духоўную матываванасць, склад (сукупнасць элементаў) і структуру (адносіны паміж гэтымі элементамі), арэал, сучасны стан [2, с. 627].

Аналіз матэрыялаў паказвае, што ў большасці выпадкаў ініцыятыва ўключэння таго ці іншага свята/абраду ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь у сённяшніх умовах

зыходзіць ад работнікаў устаноў культуры альбо іншых зацікаўленых (перадусім афіцыйных) асоб. У такім разе ўтвараецца як бы трох- і нават чатырохкутнік: ініцыятар, выканаўцы (носьбіты традыцыі), іншыя вяскоўцы, адміністрацыя. Пры афармленні дакументацыі абавязкова павінна быць экспертнае заключэнне навукоўцаў аб мэтазгоднасці надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь таму ці іншаму каляндарнаму абраду.

Дзейнасць па захаванні каляндарных свят і абрадаў прадугледжвае прыняцце мер, якія могуць забяспечыць іх жыццяздольнасць, уключаючы іх ідэнтыфікацыю, дакументаванне, даследаванне, захаванне, папулярызацыю і распаўсюджванне. Беларускі вопыт паказвае, што выяўленне ўзораў і фіксацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны ўжо ўяўляюць сабой яго захаванне. Канкрэтная праца па выяўленні і прадстаўленні таго ці іншага элемента нематэрыяльнай культурнай спадчыны звычайна становіцца моцным стымулам у ажыццяўленні падтрымкі носьбітаў народных ведаў і ўменняў, мовы, звычаяў і нораваў сямейнага і абрадава-святочнага жыцця, актывізуе работу па даследаванні, фіксацыі, падтрымцы старадаўніх каляндарных абрадаў, народных рамёстваў і г. д.

Жыццяздольнасць каляндарнай абраднасці як адной з праяў нематэрыяльнай культурнай спадчыны абапіраецца на пастаянную практыку перадачы ведаў і навыкаў, якія неабходны для яе ўвасаблення. Каляндарна-абрадавая культура, што бытуе ў сваіх першасных формах – у натуральным асяроддзі – знаходзіцца пад пагрозай знікнення ў сувязі з сыходам носьбітаў традыцыі і кантактамі з культурай горада. Некаторыя каляндарныя абрады існуюць пакуль у жывым выглядзе, але пераемнасць традыцый вусным шляхам трэба аднаўляць і спецыяльным чынам арганізоўваць. Для гэтага на сённяшні дзень ёсць пэўныя ўмовы: носьбіты традыцый і пераемнікі. Вусны спосаб пераймання заўсёды звязаны з канкрэтнай традыцыяй, і ў гэтым яго практычная значнасць. Раённыя і абласныя ўстановы культуры нашай краіны шмат робяць для стымулявання і захавання спантанных праяў традыцыйнай каляндарнай абраднасці ў натуральных умовах яе бытавання [2, с. 631].

Аднак у большасці выпадкаў правядзенне свята, зафіксаванага як элемент НКС, сёння арганізуецца пераважна клубнымі работнікамі, падтрымліваецца адміністратыўнымі мерамі. У шэрагу выпадкаў, асабліва пры ўвазе СМІ, свята/абрад можа стаць лакальным «брэндам», які прыцягвае не толькі ўдзельнікаў, але і гледачоў, турыстаў, што надае яму новыя рысы тэатралізаванага відовішча. У такім разе абрад часта «вырываецца» з традыцыйнага прасторавага кантэксту і часавай прымеркаванасці для стварэння «відовішча па замове», праводзіцца не ў вызначаны традыцыяй час, а калі зручна для тэлебачання і г. д., што, безумоўна, шкодзіць захаванню яго арганічнасці і цэласнасці.

У сучасных умовах адным з інструментаў асэнсавання і знаёмства з традыцыйнай каляндарнай абраднасцю лічыцца культурны турызм. Тут

паказ свята/абраду адбываецца з прымяненнем разнастайных інтэрактыўных сродкаў узаемадзеяння з наведвальнікамі, з непасрэдным удзелам носьбітаў этнічнай традыцыі. Існуе і такі від рэпрэзентацыі свята/абраду, як рэканструкцыя, што прадугледжвае пабудову паказу на аснове задакументаваных сведчанняў пра традыцыю, якія валодаюць дастаткова высокай доляй інфарматыўнасці і адпавядаюць крытэрыю навуковай дакладнасці. У музеях Беларусі практыкуецца і мадэляванне, калі каляндарнае свята ладзіцца з мэтай трансляцыі, актуалізацыі яго ўзораў, з выкарыстаннем імітацый [1, с. 17]. Прыкладам такога віду рэпрэзентацыі НКС з’яўляюцца традыцыйныя святы, што праводзяцца супрацоўнікамі і гасцямі музея-скансэна – Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту ў в. Строчыцы.

У беларускім грамадстве адбываецца ўзмацненне цікавасці да народных традыцый, павялічваецца роля сродкаў масавай інфармацыі, устаноў навукі, культуры і адукацыі ў распаўсюджанні ведаў пра традыцыйную культуру і ў адраджэнні народных свят. Уключэнне аб’екта ў Дзяржаўны спіс сёння з’яўляецца не толькі юрыдычным актам, але актам прэстыжу, які сігналізуе аб наяўнасці дзяржаўнай палітыкі па падтрымцы нацыянальнай культуры.

Такім чынам, аналіз практыкі надання каляндарным святам, звычаям і абрадам статусу гісторыка-культурнай нематэрыяльнай каштоўнасці і іх аховы ў Рэспубліцы Беларусь выявіў наступныя тэндэнцыі: кожнае з гэтых свят/абрадаў з’яўляецца адметным праяўленнем лакальнай культурнай традыцыі канкрэтнай мясцовасці, адпавядае метадалагічным і метадычным крытэрыям адбору, яго характарыстыка ўтрымлівае апісанне функцый, практычна-духоўнай матываванасці, складу і структуры кожнага абраду, арэала яго распаўсюджання, сучаснага стану. Вывучэнне відаў і спосабаў рэпрэзентацыі каляндарных свят і абрадаў на сучасным этапе дазваляе вылучыць найбольш перспектыўныя, да якіх адносяцца «жывое бытаванне», рэканструкцыя, мадэляванне.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. *Блищ, В. Л.* Этнографическое наследие Беларуси: возможности туристского использования / В. Л. Блищ. – Минск : БГПУ, 2010. – 118 с.

2. *Валодзіна, Т. В.* Сучасныя формы і тэндэнцыі захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны / Т. В. Валодзіна, Т. І. Кухаронак // Нарысы гісторыі культуры Беларусі : у 4 т. / А. І. Лакотка [і інш.] ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2017. – Т. 4 : Культура ХХ – пачатку ХХІ ст. – С. 620–663.

3. *Власов, А. Н.* К проблеме феноменологии локальных традиций (по результатам исследования фольклорной культуры Европейского Северо-Востока России) / А. Н. Власов, Т. С. Канева // Народная культура

Европейского Севера России : сб. науч. тр. к 10-летию кафедры фольклора и истории книги. – Сыктывкар, 2006. – С. 16–39.

4. *Гужова, И. В.* Праздник как феномен культуры в контексте целостного подхода : автореф. дис. … канд. философ. наук : 09.00.13 / И. В. Гужова. – Томск, 2006. – 21 с.

5. *Лотман, Ю. М.* Семиотика культуры и понятие текста / Ю. Лотман // Учен. зап. Тарт. гос. ун-та. – Тарту, 1981. – Вып. 515, № 5. – С. 131–176.

6. Международная конвенция об охране нематериального культурного наследия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://docs.cntd.ru/document/901978302/. – Дата доступа: 27.09.2022.

УДК 392.8(476)

**Т. А. Навагродскі,**
*доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

# ТРАДЫЦЫІ ХАРЧАВАННЯ ЯК НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА БЕЛАРУСАЎ

**Анатацыя.** *Разглядаюцца асаблівасці традыцыйнай культуры харчавання беларусаў. Выдзелены асноўныя структурныя часткі, якія дазваляюць адносіць яе да нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Адзначаецца неабходнасць фіксацыі палявога матэрыялу ад пажылых інфармантаў у этнаграфічных экспедыцыях у розныя гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны Беларусі. Падкрэсліваецца важнасць працы па ўключэнні элементаў традыцыйнай культуры харчавання ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.*

**Ключавыя словы:** *традыцыі харчавання, стравы, трапезы, народны застольны этыкет, тэхналогія прыгатавання.*

**T. Navagrodsky,**
*Doctor of Historical Sciences, professor, Head of the Department of Ethnology, Museology and History of Arts, Belarusian State University, Minsk, Republic of Belarus*

# FOOD TRADITIONS AS INTANGIBLE CULTURAL HERITAGE OF BELARUSIANS

**Abstract.** *The article examines the peculiarities of the traditional food culture of Belarusians, highlights its main structural parts that allow it to be*